*В. А. Максімовіч*
*Інстытут філасофіі НАН Беларусі (г. Мінск)*

# ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АСОБЫ Ў ПРАЦЭСЕ КУЛЬТУРАБУДАЎНІЦТВА І МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

Прырода творчасці па сваёй унутранай сутнасці звязана з неабходнасцю змены, пераўтварэння каштоўнасна-сэнсавага кантэксту культуры. Менавіта высокамастацкія артэфакты з'яўляюцца пацвярджэннем таго, што яны нараджаюцца дзякуючы актыўна дзеючаму суб'екту, здольнаму з дапамогай сваіх унутраных генерыруючых структур, шляхам акумуляцыі, праламлення і эстэтызацыі наяўнага жыццёвага, псіха-эмацыйнага вопыту ствараць тое, што пасля можа набыць якасць прызнанага ўзору нацыянальнай паэтычнай карціны свету, мастацкага шэдэўра, эталона эстэтычнай выверанасці і дасканаласці, перайсці ў разрад нацыянальнай мастацкай традыцыі. Творчы патэнцыял асобы, несумненна, можна аднесці да асаблівага сацыяльнага феномена, галоўныя характарыстыкі якога наўпрост спалучаныя з актыўна пераўтваральным стаўленнем да свету, гатоўнасцю тварыць духоўную прастору свайго быцця, генераваць нестандартныя ідэі і падыходы да вырашэння задач, якія патрабуюць асаблівай унутранай сканцэнтраванасці і засяроджанасці.

Зразумела, што фарміраванне ўнутраных духоўна-творчых інтэнцый і якасцяў не адбываецца самаадвольна, хаатычна. Інтэлектуальны складнік прадугледжвае наяўнасць пэўных генетычна (псіхалагічна) зададзеных параметраў, якія атрымліваюць сваё развіццё, самаўдасканальваюцца падчас індывідуальнага і гістарычнага станаўлення, духоўнага росту, у працэсе сацыяльнай камунікацыі. Іншымі словамі, інтэлектуальны модус грамадскага быцця неабходна разглядаць у цеснай сувязі з перадумовамі і фактарамі сацыяльнай эвалюцыі ва ўсёй складанасці яе гістарычнай абумоўленасці і шматстайнай прадстаўленасці.

Умацаванне светапоглядных і духоўна-маральных дамінант адбываецца, як вядома, у працэсе сацыялізацыі, што непарыўна звязана з засваеннем духоўных атрыбутаў папярэдніх пакаленняў і актуальнай сучаснасці. У працэсе сацыялізацыі чалавек авалодвае светам культуры, пры гэтым сацыяльнае асяроддзе выступае толькі неабходнай перадумовай структуравання пэўнага культурнага кантынууму. У складаным двуадзіным працэсе ўзаемаабумоўленага пераўтварэння (змены) значэнняў і сэнсаў, якія падкрэсліваюць творча-крэатыўную

суб'ектыўнасць, менавіта інтэлектуалізм варта прызнаць ахоўнай уласцівасцю культуры і адным з важных складнікаў жыццядзейнасці грамадства. Не выклікае ніякага сумневу, што «ў аснове ўсякага сацыяльнага працэсу ляжыць каштоўнасная структура культурнай свядомасці» і што з улікам выклікаў тэхнагеннай цывілізацыі існаванне прасторы сацыяльнага ўзаемадзеяння магчымае толькі «дзякуючы духоўным і інтэлектуальным намаганням людзей» [2, с. 84]. Гэтая заўвага мае дачыненне да характарыстыкі самага агульнага алгарытму сацыялізацыі ў прасторы культуры. Неабходна прызнаць, што дзякуючы мэтастаўленню чалавека думаючага, творчага і фарміруецца сапраўдны змест культуры. Інтэлектуалы, унутрана матываваныя на ўдасканаленне ўмоў існавання, маюць справу не з усярэдненай калектыўнай працай, а, перадусім, з адзінкавымі і ўнікальнымі з'явамі культурагенезу. У дадзеным выпадку размова ідзе не толькі пра ступень і ўзровень сацыяльна засвоеных (і прысвоеных) грамадскіх норм, канонаў, стандартаў, традыцый, якія аднесены ў разрад сістэмацэнтруючых, а пра неабходнасць абнаўлення іх якасных характарыстык, больш за тое, пра фарміраванне прынцыпова новых з'яў, структур, асобных артэфактаў са змястоўна і якасна новымі характарыстыкамі. Строга кажучы, творчасць як рэалізацыя інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу самым непасрэдным чынам звязана з тварэннем, з магчымасцю выхаду ў новае сацыякультурнае, каштоўнасна-духоўнае вымярэнне. Прычым творчасць у гэтым сэнсе разумеецца як адмысловага тыпу актыўнасць, абумоўленая ўнутраным інтэлектуальным патэнцыялам пасіянарнага тыпу асобы, якая дзейнічае дзякуючы сваёй уласнай прыродзе, субстанцыяльнай сутнасці, закладзенай у яе генезіс ў якасці феномена асаблівай, культуратворчай рэчаіснасці. Іншымі словамі, яна, творчасць, з'яўляецца не толькі ўмовай і, адначасова, прамежкавым вынікам антрапакультурагенезу, але і досыць плённай формай выяўлення, раскрыцця генетычна прадукаваных схільнасцяў, здольнасцяў, таленту. Працэс інтэрыярызацыі, засваення сацыякультурных мадэляў, узораў прадугледжвае, як яго заканамерны і патэнцыйна магчымы вынік, і змяненне або прырашчэнне каштоўнасна-сэнсавых палёў культуры. Гэта ўяўляецца магчымым у выпадку не механістычнага, на ўзроўні падсвядомых рэфлексій і ўспрыманняў, а досыць рацыянальнага, крытычнага асэнсавання базавага тэзаўрусу культуры і ўступлення з ім ва ўзаемаўзбагачальны дыялог, які ўяўляе сабой адну з формаў самаразвіцця культуры.

Важна адзначыць, што раскрыццё ўнутраных задаткаў асобы, якія маюць відавочна выяўленую творчую дамінанту, наўпрост звязана з нестандартнасцю і нетрывіяльнасцю самога спосабу мыслення,

успрымання, сэнсаўтварэння, якія, як правіла, выбіваюцца з сістэмы тыповых культурных стэрэатыпаў. Вось чаму адметнай рысай творчай інтэлектуальнай эліты з'яўляецца яе, так бы мовіць, «іншадумнае памежжа», імкненне стварыць поле варыятыўных магчымасцяў. Народжаныя ў зоне пазначанага памежжа «інавацыі здольныя больш-менш радыкальна змяніць аблічча актуальнай культуры, а ўслед за тым і актуальнасць соцыума, спрыяць іх прагрэсіўнаму развіццю (стварэнню новых каштоўнасцяў і адносін, узбагачэнню сацыякультурных формаў і напаўненню іх новымі сэнсамі і значэннямі)» [1, с. 164].

Немалаважную ролю ў гэтым адыгрываюць і міжасобасныя кантакты, суб'ектыўны складнік, звязаны з выяўленнем сімпатыі, асаблівага піетэту да пэўнага артэфакта іншанацыянальнай культуры. Гэты момант спрыяе пераадоленню супярэчнасці паміж аджылай формай, творчымі схільнасцямі суб'екта і наноў успрынятай з'явай, з неабходнасцю прысвоенай і адаптаванай да ўмоў генетычна і культурна роднаснага асяроддзя. Асобаснае прысваенне чужароднай з'явы (мастацкага канструкта, артэфакта, культурнай інавацыі) выступае і своесаблівай формай культурнай ініцыяцыі, набывае важны сэнс у развіцці і чалавечых, і міжкультурных, і міжцывілізацыйных стасункаў.

Варта заўважыць пры гэтым, што сама інтэграцыя і адаптацыя вопыту ў прастору нацыянальнай культуры не з'яўляецца працэсам адвольным, стахастычным. Наадварот, гэты працэс матываваны, усвядомлены, мэтанакіраваны, які мае свае як унутраныя, так і знешнія інтэнцыі, умовы і перадумовы. Аб'ектыўна ён пашырае межы міжкультурнага ўзаемаразумення, здымае бар'ер успрымання, сэнсавага вакууму, адчужэння і вядзе да сцірання межаў. Ствараецца сітуацыя, калі «ўзнікаюць умовы фарміравання адмысловай прасторы сацыяльнага ўзаемадзеяння, надіндывідуальнага ўтварэння як асаблівай каштоўнасці сацыяльнага паразумення, разумення сэнсу, значэння ці сэнсавай прасторы адносін. Фарміраванне прасторы ўзаемадзеяння, абумоўленай адносінамі і дзеяннямі з агульназначнымі, фіксаванымі ў ідэальных вызначэннях ... ужо змяшчае патрэбнасць будучыні» [3, с. 37—38]. У гэтай сувязі Э. В. Сайко робіць вельмі красамоўную і метадалагічна апраўданую заўвагу: «Сама будучыня, магчымасць і неабходнасць яе праектавання становіцца важным вызначальным момантам суб'ектнасці індывіда як свядомага мэтанакіраванага творцы, стваральніка новага непрыроднага свету — свету культуры» [3, с. 38]. Зробленыя заўвагі маюць самае непасрэднае дачыненне і да асобы, задзейнічанай у канстытуяванні і ўзбагачэнні традыцыі з дапамогай інавацыйных змен, у наладжванні

кантактнага дыялогу з разнастайнымі іншакультурнымі праекцыямі. Вось чаму даволі слушным ўяўляецца сцвярджэнне, што асоба, арыентаваная на традыцыю, павінна ўдзельнічаць у доўгатэрміновым культурным будаўніцтве або сваімі творчымі новаўвядзеннямі спрыяць паспяховаму ажыццяўленню гэтага праекта. Арсенал сродкаў, якія могуць уключацца ў поле структурна зменлівага культурнага ўтварэння, здольнага да пераналаджвання, перагрупоўкі, самы разнастайны, у тым ліку і ў дачыненні да яго пpасторава-часавага паходжання. Важна заўважыць, што інавацыйныя зрухі могуць адбывацца, у тым ліку, і шляхам культурнай рэканструкцыі гістарычнай спадчыны, яго «дынамічнай кансервацыі», калі даўно забытае ў новым культурназмястоўным кантэксце атрымлівае іншы ракурс бачання, гучання, успрымання. Падобны культурна-мадэрнізацыйны эфект магчымы, на наш погляд, дзякуючы, у шэрагу іншых прычын, і змене структуры складнікаў традыцыі, што набываюць новую канфігурацыю ў выніку якаснага перайначвання сістэмы з улікам дадатковых прырашчэнняў. У дадзеным выпадку як нельга лепш спрацоўвае механізм «змешвання ўсвядомленых і неўсвядомленых элементаў» (Г. Д. Бергман), аб'ектыўных і суб'ектыўных, унутрыасобасных матываваных рэгулятараў і выбарчага падыходу да засваення культурна-гістарычнага вопыту і наступнага пераводу яго ў рэестр актуальнай культуры.


**Літаратура**

1. Кондаков, И. В. Интерсубъективность культуры / И. В. Кондаков // Человек как субъект культуры / Отв. ред. Э. В. Сайко. — М.: Наука, 2002. — С.152–178.

2. Порус, В. Н. Интеллект как культурная ценность / В. Н. Порус // Вестн. Рос. филос. общества. — 2009. — №1 (49). — С. 79–85.

3. Сайко, Э. В. Субъект и субъектная составляющая в становлении и культурно-историческом выполнении пространственно-временного континуума социума / Э. В. Сайко // Человек как субъект культуры / Отв. ред. Э. В. Сайко. — М.: Наука, 2002. — С. 13–39.



*В. М. Губская*

*УА БДЭУ (г. Мінск)*


## АСАБЛІВАСЦІ ЎСПРЫНЯЦЦЯ ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАЎ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА КІТАЙСКІМ ЧЫТАЧОМ

У лютым 2018 г. спаўняецца 125 год ад нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Пакутлівы шлях выпаў на яго лёс. Змагаючыся за права слова на роднай мове, ён страціў права на